# МАЛЮНАК ЯК ІНСТРУМЕНТ ПРАЕКТНАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ-ДЫЗАЙНЕРАЎ

# DRAWING AS A MEANS FOR PROJECT THINKING FOR DESIGN STUDENTS

В.М. Гардзіёнак-Кірэева
V.M. Hardziyenak-Kireaeva

Гімназія-каледж мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка
Мінск, Рэспубліка Беларусь
Gymnasium-College of Arts named after I.O. Akhremchik
Minsk, Republic of Belarus
*e-mail: Volga-g-kireeva@yandex.by*

---

Артыкул прысвечаны аналізу ролі малюнка ў сістэме падрыхтоўкі студэнтаў-дызайнераў у сучасных умовах. Паказана ўзаемасувязь агульнай акадэмічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі дызайнераў.

*Ключавыя словы:* акадэмічны малюнак; прапедэўтычныя дысцыпліны; вучэбная праграма; дызайн-праектаванне.

The article analyzes the role of drawing in teaching modern design students. It demonstrates how general academic training can correlate with special design subjects.

*Keywords:* academic drawing; propaedeutic disciplines; syllabus; design project.

---

Захаванне лепшых традыцый і пры гэтым адпаведнасць сучасным запатрабаванням пры выкладанні дысцыпліны “акадэмічны малюнак” – адна з актуальных праблем тэорыі і практыкі. На сёняшні дзень на базе БДАМ назапашаны вялікі вопыт у сферы адукацыі, які складае падмурак акадэмічнай методыкі выкладання на факультэце дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Імклівае развіццё і засваенне кампьютарных тэхналогій, якія прапаноўваюць усё больш эфектыўныя сродкі для аўтаматызацыі працэсу праектавання, вымагае пошукаў адпаведных прыёмаў і метадаў мэтанакіраванага выкарыстання выяўленчых сродкаў. Нам, як мастакам і выкладчыкам, неабходна ўяўляць, якія сучасныя задачы павінны вырашацца ў межах дысцыпліны “акадэмічны малюнак”.

Складанасць пытанняў узаемасувязі агульнай акадэмічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі дызайнераў на факультэце дызайну з’яўляецца прычынай таго, што і сёння выкладанне малюнка і дызайн-праектавання плануецца і спраўджваецца без уліку іх узаемасувязі. Апошнім часам мы бачым страту цікавасці да малюнку сярод студэнтаў; адсутнасць навыкаў

малявання прыводзіць да нязднатнасці дакладна сфармуляваць сваю праектную ідэю на плоскасці паперы ці манітора. Наступствы такога стану рэчаў праяўляюцца ў запаволенасці развіцця праектнага мыслення падчас навучання, і ў фінале зніжаецца агульны прафесійны ўзровень выпускнікоў.

Пытанне ўзаемадачыненняў школы як захавальніка  і транслятара традыцый, з аднаго боку, і дызайну, які павінен ісці ў авангардзе прамысловай эвалюцыі, з другога, на сёння як ніколі актуальнае. Шырокае абмеркаванне праблем выкладання малюнку ў мастацка-прамысловых навучальных установах вялося на пачатку 60-ых гадоў мінулага стагодзя, калі абвастрылася дыскусія аб прыродзе і спецыфіцы дызайну. У 1963 годзе ў часопісе “Декоративное искусство СССР” быў надрукаваны артыкул С. Колас “Учитывать специфику”, у якім сцвярджалася адмаўленне ад традыцыйнай адукацыі малявання з натуры, бо яна, маўляў, замінае творчаму працэссу. У артыкуле ішла гаворка пра неабходнасць карэннай перабудовы метадаў выкладання малюнку ў мастацка-прамысловых ВНУ. Супрацьлеглае меркаванне выказаў у 1973 годзе М. Томскі. Але аўтары аднабакова вызначылі абодва віды малюнку: “універсальны”(акадэмічны) і спецыяльны, які ўлічвае асаблівасці прафесіі. У выніку абмеркаванне праблемы звялося да спрэчкі пра тэрміналогію. Пытанне “павісла ў паветры”, і толькі ў 1987 годзе на Міжвузаўскай канферэнцыі па малюнку, якая праходзіла на базе Строганаўскай вучэльні, прафесар Ф.Ф. Валашко агучыў думку пра прызванасць малюнку забяспечыць працэс стваральнага, канструктарскага мыслення будучага прафесіянала. На той момант, як і сёння, пытанне ўзаемасувязі “акадэмічнага малюнку” са спецыфічнымі праектнымі задачамі разглядаецца пераважна тэарэтычна і не мае сур’ёзнай практычнай базы.

Гэтыя праблемы актуальныя як для нас, так і для нашых калегаў-выкладчыкаў замежных падобных па спецыфіцы ВНУ. У красавіку 2013 года мы разам са студэнтамі наведвалі польскі Ўніверсітэт Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне, факультэт графічнага дызайну. Пры бясспрэчна добрай тэхнічна-прафесійнай уладкаванасці вучэбнага працэсу, якая дае перавагу магчымасцям, назіраецца заняпад узроўню малявання студэнтаў, імкненне да спрошчаных, амаль піктаграмных выяваў , узнаўленне зрокавых, прапанаваных кампьютарам клішэ. Праблема збяднення графічнай выяўленчай мовы, страты школы малявання глабальная.

Нашае меркаванне палягае на тым, што захоўваць традыцыі школы малявання неабходна. Неабходна і ўвядзенне ў адукацыйную праграму спецыяльных курсаў па малюнку для дызайнераў, якія б улічвалі прафесійную спецыфіку і спрыялі ліквідацыі разрыва ў выкладанні малюн-

ка, жывапісу і спецпраектавання. Такім можа стаць курс “малюнак па ўяўленню”, да якога павінны спрычыніцца нашы калегі-выкладчыкі дысцыплінаў па дызайн-праектаванню.

Назіраецца тэндэнцыя агульна слабой падрыхтаванасці студэнтаў, якія прыходзяць вучыцца на першую ступень вышэйнай адукацыі. Многія з іх не гатовыя да патрабаванняў вышэйшай школы. У выніку недахопу інтэлектуальнай сталасці і першапачатковай матывацыі ў іх зніжана цікавасць да акадэмічных прадметаў. Базавая дысцыпліна “акадэмічны малюнак” складаная і патрабуе доўгатэрміновай практыкі. Тэндэнцыя спрашчаць метадычныя праграмы, скарачаць дзяржаўнымі стандартамі колькасць акадэмічных гадзінаў базавых прадметаў- гэта шлях да прафанацыі адукацыі.

Варта адзначыць некаторыя аспекты гэтай непрыемнай тэндэнцыі. Так склаліся абставіны, што ў акадэмію сёння прыходзяць вучыцца студэнты з вельмі розным пачатковым узроўнем засвоеных ведаў па акадэмічнай дысцыпліне “малюнак”. Адаптаваць пад слабага студэнта вучэбную праграму не мае сэнсу. Праграма патрабуе ад усіх выканання пэўных заданняў паступова, ад простага да ўсё больш складанага, прапісаны крытэрыі адзнак. Але практыка выніковых праглядаў паказвае- тое, што адным студэнтам па сілах, для іншых- невыканальна (часцей за ўсё па прычыне слабай першапачатковай падрыхтоўкі). Аб’ектыўна ацаніць вынікі праблематычна і таму існуе практыка выстаўлення адзнак адносна лепшай працы на курсе ці ў групе, адносна папярэдніх вынікаў самога студэнта. Такім чынам, размываюцца межы крытэрыяў, складаецца сістэма адноснасцяў. Акрамя гэтага, розніца ўзроўняў малявання сярод студэнтаў і адпаведна розніца іх прэтэнзій на прафесійны ўзровень пры агульных для ўсіх тэмах задання парушае атмасферу цікавасці. Выкладчыкі, адчуваючы сваю незапатрабаванасць, таксама губляюць цікавасць да падобнай аўдыторыі. Суб’ектыўныя адзнакі на праглядах – сігнал страты матывацыі ў педагогаў.

Нам падаецца неабходным падумаць пра новую форму падачы ведаў і практыкі ў выкладанні малюнка. Мы прапануем абмеркаваць ідэю трохступенчатай сістэмы падрыхтоўкі – “прапедэўтычную”, “базавую” і “спецмалюнак”. Першая ступень (максімальны бал 4) прадугледжвае маляванне геаметрычных фігураў, нацюрморту. Другая ступень (максімальны бал 8) – гэта гіпсавыя экаршэ, азнакамленне з выяўленнем жывой мадэлі, хуткі малюнак (скеч). А трэццяя ступень – гэта маляванне з улікам прафесійнай спецыфікі. Тэмамі заданняў на гэтам этапе могуць быць: складаныя ракурсы фігуры чалавека, контражур, малюнак інтэр’ераў і экстэр’ераў, складак адзення, складаных аксесуараў і тэхнічных

дэталяў, малюнак па ўяўленню рознымі матэр'яламі (ў тым ліку, з выкарыстаннем лічбавых і камп'ютарных сродкаў). Пры гэтам выкладчыкі павінны быць гатовы працаваць па індывідуальнай праграме з улікам індывідальных прафесійных запатрабаванняў студэнтаў. Трэццяя ступень – гэта сваеасаблівая "вучэбна-творчая майстэрня", у якой цікава працаваць і студэнту, і выкладчыку.

Ва ўмовах трохступенчатай сістэмы навучання малюнку мы змаглі б прапанаваць студэнтам адэкватныя заданні адносна ўзроўню іх падрыхтоўкі і і запатрабаванняў. Выніковая адзнака ў дыплом можа ставіцца з улікам той ступені, якую засвоіў навучэнец. Такая сістэма, паводле нашага меркавання, дапамагла б забяспечыць выкладчыкам больш эфектыўнае выкарыстанне іх творчых прафесійных магчымасцяў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Атавин, Ю.А. Предмет и пространство в учебном рисунке. Специфика рисовальных школ художественно-промышленого прфиля. Учебное пособие / Ю.А. Атавин – М.: МГХПУ им. С.Г. Строганова, 2004. – 250 с.
2. Горелов, М.В. Рисунок как инструмент проектного мышления: автореферат дис. ... канд. искусствовед.: 17.00.06 / М.В. Горелов; Рос.акад. наук; Московский государственный художественно-промышленный университет им. С.Г. Строганова. – М.,2006. – 32 с.
3. Строгановская школа рисунков / Моск. гос. худож.-пром. ун-т им. С.Г. Строганова; [Сост. В.Ф. Губко и др.]. – М.: Сварог и К, 2001. – 348 с. Горелов М.В. Развитие концепции учебного рисунка в Строгановском училище в 1825 - 1880 годы // Сб. ВНИИТЭ. - М., 2006.
4. Хитрук, А.Е. Рисунок: учебное пособие / А.Е. Хитрук. – М.: Легкая индустрия,1964. – 224 с.